VI ПЛЕНУМ АБКОМА КПБ

# УДАСКАНАЛЬВАЦЬ РАБОТУ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ

## ДАКЛАД ПЕРШАГА САКРАТАРА АБКОМА КПБ А. Н. АКСЁНАВА

9 чэрвеня адбыўся чарговы, VI пленум абласнога камітэта КП Беларусі.

Пленум абмеркаваў пытанне «Аб стане і мерах паляпшэння работы партарганізацый з кадрамі сярэдняга звяна ў калгасах і саўгасах вобласці».

Удзельнікі пленума заслухалі інфармацыю аб выкананні пастановы III пленума абкома КПБ «Аб задачах партарганізацый вобласці па павышэнню адказнасці камуністаў за выкананне Статута КПСС».

З дакладам «Аб стане і мерах паляпшэння работы партарганізацый з кадрамі сярэдняга звяна ў калгасах і саўгасах вобласці» выступіў першы сакратар абласнога камітэта партыі А. Н. Аксёнаў.

— Працоўныя нашай вялікай Радзімы, — адзначыў дакладчык,

гаспадарак ажыццёўлен вялікі аб'ём культуртэхнічных работ.

За дасягнутыя поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці, выкананне планаў нарыхтовак прадуктаў сельскай гаспадаркі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР калгас «Камінтэрн» Аршанскага раёна ўзнагароджан ордэнам Леніна, а калгас імя Чырвонай Арміі Віцебскага раёна — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Аршанскі раён, калгас імя Дзяржынскага гэтага раёна, калгас імя Чырвонай Арміі Віцебскага раёна і саўгас «Сітцы» Докшыцкага раёна выйшлі пераможцамі ва ўсесаюзным спаборніцтве 1966 года, і ім прысуджаны пераходныя

«Полымя» Сенненскага раёна Е. В. Шаўкун, саўгаса «Гарадоцкі» — П. Ц. Сабалеўскі, саўгаса «Сялюты» Віцебскага раёна — М. Д. Канарская, калгасаў імя Суворава Сенненскага раёна — Е. Г. Мядзведзеў, «Расія» Талачынскага раёна — М. М. Зянькоў і многія іншыя.

У калгасе імя Калініна Глыбоцкага раёна 17 год працуе брыгадзірам вытворчай брыгады № 1 камуніст Уладзімір Канстанцінавіч Вайцецкі. За брыгадай замацавана звыш тысячы гектараў сельгасугоддзяў, з якіх 600 гектараў ворыва.

Па кожнаму важнаму пытанню Уладзімір Канстанцінавіч раіцца са спецыялістамі і перадавікамі вы-

З 1964 года працуе брыгадзірам сёмай паляводчай брыгады саўгаса аграном Павел Цімафеевіч Сабалеўскі. Раней ён узначальваў дзевятую брыгаду, якая займала першае месца. Партыйная арганізацыя рэкамендавала яго на адстаючы ўчастак. У сёмай брыгадзе, якую ён узначаліў, 990 гектараў сельгасугоддзяў, у тым ліку 640 гектараў ворнай зямлі, а працаздольных людзей усяго 35 чалавек. На кожнага прыходзіцца 19 гектараў ворыва. Тав. Сабалеўскі здолеў згуртаваць рабочых у дружны калектыў. Тут чотка арганізавана праца, наладжан строгі ўлік. Усе важнейшыя пытанні вырашаюцца на брыгадных сходах. Брыгадзір часта выступае перад рабочымі з

дзяцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, ставяцца чарговыя задачы, чытаюцца лекцыі і даклады. Усё гэта садзейнічае павышэнню ролі брыгадзіраў і загадчыкаў ферм як арганізатараў і выхавацеляў, паляпшэнню палітычнай работы, арганізацыі працы і ўмацаванню працоўнай дысцыпліны.

Бюро райкома КПБ сістэматычна разглядае пытанні паляпшэння падбору, расстаноўкі і выхавання кадраў сярэдняга звяна. Гэтыя пытанні абмяркоўваюцца і на савеце раённага вытворчага ўпраўлення сельскай гаспадаркі.

Райком КПБ і раённае вытворчае ўпраўленне рэгулярна праводзяць з калгаснымі і саўгаснымі

доўчых ферм 15 працэнтаў маюць вышэйшую і сярэднюю адукацыю, 44 працэнты — незаконченую сярэднюю і 41 працэнт — пачатковую адукацыю. Партыйная праслойка сярод брыгадзіраў складае 57 працэнтаў і сярод загадчыкаў жывёлагадоўчых ферм — 40 працэнтаў.

Некаторыя брыгадзіры нідзе не вучацца, не чытаюць газет і кніг, дрэнна працуюць з людзьмі і па сутнасці не спраўляюцца з даручанай справай.

Каб паспяхова дабіцца павышэння ўрадлівасці палёў і прадукцыйнасці жывёлагадоўлі, умацавання эканомікі калгасаў і саўгасаў, вельмі важна ўмацаваць кіраўніцтва брыгадамі і фермамі падрых-

няемасць кадраў сярэдняга звяна. У калгасе «Свабода» Шаркаўшчынскага раёна ў трох комплексных брыгадах з 1957 года зроблена 18 замен брыгадзіраў. У брыгадзе № 2 за 10 год брыгадзіры мяняліся 10 разоў. У першай і трэцяй брыгадах за гэты перыяд замена брыгадзіраў рабілася 8 разоў. Некаторыя брыгадзіры, якія не справіліся з работай у адной брыгадзе, перастаўляліся ў іншыя брыгады.

Некаторыя райкомы партыі, райвыканкомы і раённыя вытворчыя ўпраўленні дрэнна ведаюць становішча спраў у брыгадах і на фермах, не даходзяць да гэтых рашаючых участкаў сельскагаспадарчай вытворчасці. А аказваць на іх дзейсны ўплыў можна шляхам удумлівага падбору, расстаноўкі і выхавання брыгадзіраў і загадчыкаў ферм.

З поўным тэкстам дакумента магчыма азнаёміцца ў бібліятэцы